# КАЛЯНДАР СТРЫЖАК НА ЧЭРВЕНЬ

**4 чэрвеня, пятніца.** Неспрыяльны дзень для наведвання майстра-цырульніка, стрыжка можа значна запаволіць рост валасоў.

**5 чэрвеня, субота.** Стрыгчыся не рэкамендуецца. У афарбоўванні добрым выбарам будуць цёмныя адценні, яны дапамогуць дасягнуць унутранай гармоніі і спакою.

**6 чэрвеня, нядзеля.** Новая прычоска дадасць свежых сіл, паспрыяе прыняццю правільнага рашэння, уняce ў жыццё разнастайнасць і новыя ўражанні.

**7 чэрвеня, панядзелак.** Добры дзень для новай прычоскі, але варта ўлічыць, што пасля стрыжкі валасы будуць расці больш павольна, чым звычайна.

**8 чэрвеня, аўторак.** Удалы для стрыжкі дзень: яна абвострыць інтуіцыю і праніклівасць.

**9 чэрвеня, серада.** Стрыжка валасоў сёння супрацьпаказана. Яна можа дрэнна адбіцца на вашым псіхічным стане.

**10 чэрвеня, чацвер.** Устрымайцеся ад стрыжкі — інакш могуць здарыцца непрыемнасці са здароўем, з'явіцца чарада няўдач і сама стрыжка апынецца вельмі няўдалай.

**11 чэрвеня, пятніца.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі, афарбоўкі і завіўкі валасоў. Калі пастрыгчы валасы ў гэты дзень, яны стануць непаслухмяныя, прычоска атрымаецца бясформенная.

**12 чэрвеня, субота.** Сёння не трэба стрыгчы валасы, лепш займіцеся іх аздараўленнем. Таксама добры дзень для афарбоўвання, таніравання альбо меліравання.

**13 чэрвеня, нядзеля.** Сёння не рэкамендуецца рабіць стрыжку — яна можа негатыўна адбіцца на вашым здароўі. Цёмнае афарбаванне валасоў у гэты дзень дапаможа стаць «нябачнымі» для непрыемнасцяў.

**14 чэрвеня, панядзелак.** Дзень падыходзіць для любых эксперыментаў з прычоскай. Мяняйце колер, даўжыню, рабіце новую стрыжку. З пераменамі вы скінеце з сябе негатыў, няўдачы застануцца ззаду.

**15 чэрвеня, аўторак.** Добры дзень — валасы хутка растуць, умацоўваюцца і паляпшаюць сваю структуру, менш сякуцца, доўга захоўваюць форму і прыгажосць.

**16 чэрвеня, серада.** Выдатны дзень для стрыжкі — яна не толькі атрымаецца раскошная, але і істотна падыме вам самаацэнку, падорыць натхненне, прыцягне да вас захапленне і любоў з боку навакольных.



**17 чэрвеня, чацвер.** Спрыяльны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Стрыжка спрыяе набыткам і багаццю. Удалы дзень для асвятлення валасоў.

**18 чэрвеня, пятніца.** Стрыгчыся ў гэты дзень непажадана, бо пасля можа пачацца выпадзенне валасоў.

**19 чэрвеня, субота.** Стрыжка будзе вельмі ўдалая — яна зробіць валасы больш здаровымі, густымі. Стане менш пасечаных кончыкаў. Таксама гэта добры дзень для таніравання і афарбоўвання.

**20 чэрвеня, нядзеля.** У згаданы дзень не рэкамендуецца рабіць стрыжку. У Космасе пераважае наймагутнейшая негатыўная энергетыка. Падрэзаўшы валасы, можна прыцягнуць мора шкоднай энергіі, якая нанясе здароўю непапраўную шкоду.

**21 чэрвеня, панядзелак.** Стрыжка ў гэты дзень павялічыць матэрыяльнае багацце, а месяц забяспечыць добры рост валасоў.

**22 чэрвеня, аўторак.** Добры дзень для наведвання салона прыгажосці. Новая прычоска будзе ўдалая і дапаможа здабыць аптымістычны настрой, дадасць упэўненасці ў сабе.

**23 чэрвеня, серада.** Ідэальны дзень для тых, хто жадае стаць больш актыўным, пазітыўным і жыццярадасным. Стрыжка прыцягне ўдачу і добрыя ўражанні, новыя сустрэчы і знаёмствы.

**24 чэрвеня, чацвер.** Сёння не рэкамендуецца стрыгчы валасы, бо можна атрымаць не той вынік, які хочацца. Варта выбраць нейкі вельмі просты і зручны варыянт прычоскі.

**25 чэрвеня, пятніца.** Стрыжка ў гэты дзень дабратворна ўплывае на працаздольнасць, здароўе і фізічную актыўнасць. Нават невялікая змена колеру валасоў акажа станоўчы ўплыў на ваш сацыяльны статус.

**26 чэрвеня, субота.** У цэлым нейтральны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Але калі пафарбаваць валасы ў русы колер, можна дамагчыся павышэння аўтарытэту на рабоце і дома, ёсць шанц палепшыць паразуменне з навакольнымі.

**27 чэрвеня, нядзеля.** Новая прычоска падыме настрой, павысіць самаацэнку і веру ва ўласныя сілы, афарбоўванне ў яркі колер прыцягне да вас пазітыўных і сапраўды патрэбных людзей.

**28 чэрвеня, панядзелак.** Выдатны дзень для змены іміджу. Калі вы даўно марылі пра новую экстравагантную стрыжку і незвычайнае афарбоўванне, то гэта дзень для таго, каб удала ажыццявіць вашу ідэю.

**29 чэрвеня, аўторак.** Вельмі неспрыяльны час для наведвання салона прыгажосці.

**30 чэрвеня, серада.** Не спрабуйце «падмануць» астралагічны прагноз — стрыжкі сёння бесперспектыўныя. Выкрасліце з планаў наведванне цырульні.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.42 | 21.35 | 16.53 |
| Віцебск — | 4.24 | 21.32 | 17.08 |
| Магілёў — | 4.32 | 21.25 | 16.53 |
| Гомель — | 4.37 | 21.12 | 16.35 |
| Гродна — | 4.59 | 21.48 | 16.49 |
| Брэст — | 5.08 | 21.40 | 16.32 |

### Месяц

*Апошняя квадра 2 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр. Івана, Міхаіла, Уладзіміра.*
*К. Эмы, Караля, Францішка.*



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 4 ЧЭРВЕНЯ

**У краіне**

**1252** год — згадванне ў Іпацьеўскім летапісе пра горад Ваўкавыск, якое доўгі час лічылася першым. Па археалагічных жа звестках горад як крэпасць паўстаў ужо ў канцы Х стагоддзя. Магдэбургскае права горад атрымаў у 1503 годзе. Герб Ваўкавыска, які з'явіўся ў XVI стагоддзі, — галава ваўка на блакітным полі. Сёння Ваўкавыск — цэнтр развітой харчовай прамысловасці.

**1801** год — нарадзіўся Міхаіл Паўлавіч Бястужаў-Румін, дзекабрыст, падпаручнік. З 1820 года — у лейб-гвардыі Сямёнаўскага палка, пасля паўстання якога ў 1820-м і расфарміравання пераведзены ў Палтаўскі пяхотны полк, які з 1823 года размяшчаўся ў Бабруйскай крэпасці. З 1823 года — член Паўднёвага тайнага таварыства. Адзін з распрацоўшчыкаў Бабруйскага плана дзекабрыстаў. Прыхільнік знішчэння самадзяржаўя і ўстанаўлення рэспублікі. Разам з Мураўёвым-Апосталам склаў рэвалюцыйны катэхізіс і пракламацыі да паўстанцаў. У 1826 годзе быў арыштаваны і дастаўлены ў Магілёў, затым адпраўлены ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Па рашэнні Вярхоўнага крымінальнага суда ў тым жа годзе быў пакараны смерцю.

**1918** год — апублікавана першае выданне «Беларускай граматыкі для школ» Браніслава Тарашкевіча.

**У свеце**

**1800** год — у Вашынгтоне завершана будаўніцтва Белага дома як рэзідэнцыі кіраўнікоў амерыканскай дзяржавы, і ў яго заехалі першыя насельнікі: прэзідэнт Джон Адамс з жонкай.

**1896** год — выпрабаванне першага аўтамабіля, пабудаванага Фордам, было затрымана на цэлую гадзіну, паколькі аказалася, што аўтамабіль шырэйшы, чым дзверы гаража, у якім яго стварылі.

**1916** год — пачатак Брусілаўскага прарыву, адной з найбуйнейшых і паспяховых наступальных аперацый Паўднёва-Заходняга фронту рускай арміі пад камандаваннем генерала А. А. Брусілава падчас Першай сусветнай вайны. Найбуйнейшая бітва вайны па сумарных стратах.



**Так гаварыў...**

**ФРЫДРЫХ ШЫЛЕР:**

*«Лепш жахлівы канец, чым бясконцы жах».*



**З прыгожай круглай датай, з 90-годдзем, шчыра віншуем Фёдара Сакратавіча СІГАЯ!**
**Зычым моцнага здароўя, дабрабыту, бадзёрасці на многія-многія гады!**

**З павагай брат Васіль, пляменніца Алена з дзецьмі.**



Прынosім шчырую падзяку **Іне Алегаўне КАЗЮКОВАЙ**, загадчыцы 7-га пульманалагічнага аддзялення Магілёўскага супрацьтуберкулёзнага дыспансера. Перахварэўшы на COVID-19, мы зразумелі: нас лячыў сапраўдны Доктар, сапраўдны Чалавек, Прафесіянал. Выдатна, што ў краіне жывуць і працуюць такія людзі.

**Па даручэнні хворых Анатоль Ракіцкі.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1511. Нумар падпісаны ў 19.30 3 чэрвеня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12